ВЫБАР

ГАЗЕТА ДЭМАКРАТЫЧНЫХ ПЛЫНЯЎ ПРЫДЗВІНСКА-ПРЫДНЯПРОЎСКАГА КРАЮ

№ 6 (12) 18 сакавіка 1992 г. Цана 40 кап.

Прости их, Господи, ибо не ведают, что говорят

«Ты меня любишь?—Да, люблю»

5—6 марта в городе Витебске находился председатель Совета Министров Республики Беларусь Вячеслав Францевич Кебич. Он побывал на предприятиях города, выступил перед специалистами сельского хозяйства и военнослужащими. Краткие фрагменты из выступлений по политическому моменту редакция предлагает своим читателям.

«В присутствии консультантов, которые были с нами и все время не уходили, мы подписали соглашение. Я хочу сказать, что всеми нами каким-то образом овладела эйфория. Чем дальше, тем счастье все более овладевало нами. Казалось, мы создаем что-то новое, решаем новые вопросы. Это всегда так с тем, кому дают свободу. А он, радостный, создает что-то такое, что никому не дано создать.

Когда мы подписали, что все законы Союза на территории суверенных государств отныне не действуют, то тут что только было! Нами овладели такие эмоции, что некоторые тут же потребовали, чтобы на стол подали шампанское.

Когда мы вышли из этой закрытой комнаты, эксперты сказали: «А вы знаете, что вы такое сотворили? Вы же в общем-то не просто путчисты, вы—пущисты». Так мы и получили это название: пу—щисты, по имени пущи, в которой в общем-то совершили государственный переворот. Да что там говорить?! Да, так! Ну, так!

С точки зрения государственной безопасности я скажу, что, если бы органы безопасности Советского Союза стояли как надо на страже соблюдения закона, то достаточно было одной вашей роты, чтобы этих пущистов взять в затылок и кончить весь этот переворот. Но я так понимаю, что и разведка, и органы государственной безопасности,и мы не понимали, что мы делали. Вот ЧП состоялось. ЧП в Беловежской пуще.

В. КЕБИЧ, премьер-министр Республики Беларусь (из выступления среди офицерского состава Витебской области).

* * *

«Что на сегодня представляет из себя СНГ? Если мы думаем, что мы создали из СНГ новое какое-то образование, мы глубоко ошибаемся. Это есть, может быть, в какой-то мере попытка не развалиться всем нам до конца. И любое решение, которое мы принимаем, это решение хорошей компашки, извините меня, за столом, под рюмочкой, договориться, что завтра мы будем любить друг друга: «Ты меня любишь?—Да, люблю.—И я тебя люблю». И никаких обязательств друг перед другом нет. И любые решения, которые мы принимаем, не являются ни для кого обязательными».

В. КЕБИЧ,
премьер-министр Республики Беларусь (из выступления на собрании аграрников Витебской области). (Магнитофонная запись Е. МАЛЬЧЕВСКОЙ).

ОТ РЕДАКЦИИ. Подобное откровение государственного мужа вызывает не только недоумение, но и гражданское возмущение. С какой целью говорил все это В. Кебич!

Редакция газеты «Выбор» обращается с просьбой к народным депутатам Верховного Совета Республики Беларусь дать соответствующую оценку этим высказываниям премьера.

СВЯТА НЕЗАЛЕЖНАСЦІ

25 сакавіка 1918 года ў Менску была абвешчана незалежная Беларуская Народная Рэспубліка. Такім чынам беларускія нацыянальна-дэмакратычныя сілы ажыццявілі шматвяковую мару нашага народа аб незалежнай дзяржаве. Гэтаму папярэднічала цяжкая праца шчырых беларусаў па адраджэнню духоўнае моцы нацыі на працягу дзесяцігоддзяў.

Святкаванне ўгодкаў абвешчання БНР стала добрай традыцыяй на эміграцыі і Беларусі, у прыватнасці ў нашым горадзе. І ў гэтым годзе, паводле слоў старшыні Віцебскае Рады БНФ М. Паўлава, суполка таксама наладзіць шэраг урачыстых імпрэз.

25 сакавіка адбудзецца беларускае каталіцкае набажэнства з удзелам ксяндза У. Пятрайціса з Мёраў у капліцы касцёла св. Варвары. Выкладчык ВДПІ, мастак Ю. Якімовіч прымеркаваў да свята выставу жывапісу, які апавядае пра помнікі дойлідства Беларусі (у абласным навукова-метадычным цэнтры народнае творчасці). Увечары пройдзе канцэрт беларускамоўных рок-гуртоў у памяшканні акадэмдрамтэатра імя Я. Коласа.

Юрась СЬЦЯПАНАЎ.

Демократия по-большевистски

Согнали депутата с трибуны

На прошедшем недавно в Витебске собрании группы народных депутатов, включившихся в работу по проведению 17 марта этого года 6-го съезда Верховного Совета СССР, царила эйфория. Собравшиеся жаждали возврата СССР. И стоило депутату горсовета Х. Желяпову подать трезвый голос, его тотчас же согнали с трибуны.

Редакция публикует текст несостоявшегося выступления Х. Желяпова.

Уважаемые коллеги депутаты!

Дорогие витебчане!

Здесь было произнесено много пламенных слов. Я же хочу обратиться к вашему благоразумию и просить вас трезво взглянуть на реальную жизнь.

Уважаемые депутаты! Мы—народные избранники. И, когда нам народ доверял свои голоса, он рассчитывал, что мы будем на страже закона и справедливости. Чего же требует от нас реальность и закон?

Да, народ проголосовал год назад за сохранение Союза. Во исполнение воли народа, совещание в Ново-Огареве подготовило к подписанию проект договора. Однако выступление кучки заговорщиков, отстранивших законно избранного президента от власти, разрушило Ново-Огаревский процесс. В результате суверенные советские республики волей своих избранников, народных депутатов объявили о независимости. В том числе и наша Беларусь.

Независимость Беларуси—это была воля Верховного Совета, высшего законодательного органа нашего государства. Мы что же, будем нарушать закон? Ликвидируем государство Беларусь, признанное более 70 странами и являющееся членом Организации Объединенных Наций? Избранный Верховным Советом председатель в рамках своих законных полномочий подписал соглашение о создании Содружества независимых государств. Верховный Совет ратифицировал это соглашение. И не нам, представителям народа,выступать против решений Верховного Совета.

Дорогие коллеги! Историю вспять не воротить. И не разумно трезвым политикам заниматься этим делом. Мы живем в независимом государстве Беларусь и наша задача—подумать о том, как устроить жизнь нашего народа свободной и благополучной.

Вот о чем должен думать народный избранник, вот на что должны быть направлены его разум и энергия.

Можно ли вернуться назад? К этой форме государства и к той форме правления? Можно, но только силой и через народную кровь. Уверен, что никто из здесь присутствующих не думает, что это наш путь. Наш путь совершенствование демократических основ, продвижение социальных и экономических реформ.

Наша цель—свободная личность в процветающем демократическом государстве.

Х. ЖЕЛЯПОВ, народный депутат Витебского горсовета, председатель городского депутатского клуба.

Так было заўсёды: хто каго! Святло змагаецца з цемрай, дабро—са злом, чырвоныя—з белымі, дэмакраты—з партакратыяй. Праўда, не было ніколі ў барацьбе супрацьлегласцей так сумленна, бяскрыўдна і бестурботна, як у гэтых вясёлых людзей. А шкада.

На здымку: *віцебскія рабочыя ў час адпачынку.*

У. Кулакоў:

«Поезд адышоў, вось і ўсё тут пытанне»

Палітычная тэмпература ў Віцебску робіцца ўсё вышэйшай. Можна прайшоўшую тут спробу па скліканню нечарговага з'езда СССР назваць пусканнем бурбалак у след знікшаму ў невядомым напрамку поезду гісторыі. Але ж высокая тэмпература можа прывесці да крытычнай рысы кіпення.

Са сваімі сумненнямі наконт гэтага наш карэспандэнт Яўгенія Мальчэўская звярнулася да старшыні абласнога Савета, народнага дэпутата Рэспублікі Беларусь Уладзіміра Панцялеевіча Кулакова. Іх размова перад табою, чытач.

—Уладзімір Панцялеевіч, на сесіі Вярхоўнага Савета 25 жніўня была абвешчана незалежнасць Рэспублікі Беларусь. Якая была ваша пазіцыя як народнага дэпутата ў той час?

—Я галасаваў за незалежнасць рэспублікі. У гэтым мая пазіцыя як дэпутата і старшыні абласнога Савета. Цяпер рэспубліка ўстанаўлівае дыпламатычныя адносіны з другімі дзяржавамі, з'яўляецца членам ААН. Усе атрыбуты незалежнасці ёсць і я іх падтрымліваю.

—Пасля трагічна вядомых жнівеньскіх падзей, калі праваліўся ГКЧП, вы выйшлі са складу Віцебскага бюро абкома і з камуністычнай партыі. Якія пераасэнсаванні прывялі вас да гэтага? І як вы зараз адносіцеся да таго, што гэта партыя аднаўляецца пад новай абрэвіятурай, але з тымі ж людзьмі?

—Я лічу, што ў грамадстве павінен быць плюралізм думак. І, калі ёсць людзі, якія вераць у камуністычныя ідэалы і хочуць адрадзіць партыю, гэта іх права.

—І ўсё ж такі, што вас прывяло да пераасэнсавання?

—Ёсць камуністычныя партыі ў Францыі, у Італіі ёсць, у былой дэмакратычнай Германіі, у Расійскай федэрацыі... Калі ёсць людзі, якім блізкія камуністычныя ідэалы, яны вераць у іх, то чаму б не стварыць сваю партыю.

Што адносна мяне, то я пакуль па-за партыяй. Ні ў адну не ўступаю. Як старшыня абласнога Савета лічу, што для мяне больш правільна быць зараз па-за імі, каб больш поўна і больш аб'ектыўна адлюстроўваць інтарэсы ўсіх слаёў насельніцтва, у тым ліку ўсіх палітычных тэндэнцый, таму што ўжо сёння ў рэспубліцы іх больш дзесяці. І калі кіраўнік у такім вялікім кангламерацэ партый будзе належаць нейкай адной, гэта будзе вельмі няправільна.

—Як кіраўнік вобласці, вы лічыце, што найлепш быць сёння па-за партыяй, таму хачу задаць вам пытанне як дэпутату Рэспублікі Беларусь, за незалежнасць якой вы галасавалі і якую прызнаеце самастойнай дзяржавай. Наколькі правамерна была ініцыятыва часткі дэпутацкага корпусу вобласці праводзіць у нас у горадзе сход па аднаўленню былога Саюза, камуністычнай партыі, скліканню сесіі народных дэпутатаў СССР?

—Наколькі я **помню** па друку (я там не быў) пытанне стаяла крыху іначай: па скліканню з'езда народных дэпутатаў СССР. Кожны чалавек мае права выказваць сваю думку. У аднаго такая думка, у другога—такая.

—Але ж, з'езда СССР, з незалежных ужо дзяржаў?!

—Усё гэта так. Але гэта права кожнага чалавека на думку. Мы гаворым увесь час аб дэмакратыі, а з другога боку гаворым, што нехта павінен дзейнічаць так, а нехта—так. У іх—такая пазіцыя, у вас, наколькі разумею, іншая?...

—Мая—у адпаведнасці з пазіцыяй Рэспублікі Беларусь як незалежнай дзяржавы.

—Усё гэта так. Але ў другіх пазіцыя другая.

—Але ж такая пазіцыя можа прывесці да канфрантацыі і ўнутры, і паміж дзяржавамі?

—Я не думаю, што гэта прывядзе да нейкай канфрантацыі... Лічу, што па гэтаму пытанню правільна сказаў прэм'ер-міністр В. Кебіч, які быў на сходах у Віцебску. Поезд адышоў. Вось і ўсё тут пытанне. Гэты сход па скліканню з'езда народных дэпутатаў СССР не быў нашай ініцыятывай.

—Маецца на ўвазе, вашай як кіраўніцтва вобласці?

—Я аб гэтым даведаўся з друку толькі пасля.

АД КАРЭСПАНДЭНТА: аб маральным праве на правядзенне з'езда народных дэпутатаў СССР гаварыў беларускі прэм'ер-міністр, які пабываў у Віцебску. Аб праве на плюралізм думак з гэтай нагоды выказана ў інтэрв'ю. Аднак народныя дэпутаты суседняй дзяржавы лічаць такое права ні чым іншым, як замахам на суверэнітэт Расіі.

Кто нас контролирует

Компетентен ли начальник?

В газете «Витебский рабочий» за № 19 (5.02.92 г.) была помещена статья «У «Вераса» пакуль кветачкі» за подписью начальника управления государственной инспекции по торговле и защите потребителей при Совете Министров Республики Беларусь в Витебской области В. Миненка.

Нас автор обвинил в том, что в результате завышения цен мы перебрали с покупателей 142 тысячи рублей. Автор настоятельно требовал возврата в бюджет около 300 тысяч рублей с учетом штрафа.

Казалось бы, если есть спор, то нужно обращаться в суд и доказывать свою правоту. Однако, Владимир Миненок направляет грозные письма в налоговую инспекцию, Виткомбанк, чтобы они в безакцептном порядке списали с нас деньги, а последним даже грозил прокуратурой.

Мы ему неоднократно объясняли, что он не прав, так как Положение о механизме формирования в 1990—1991 годах договорных (свободных) цен на товары народного потребления (постановление СМ СССР от 12.11. 90 г. № 1134) распространялось в 1991 году в части оптовых надбавок только при реализации отечественных и импортных товаров государственными оптовыми предприятиями.

Наше предприятие не относится к государственным предприятиям, и мы это доказали в судебном порядке.

Более того, нашу правоту подтвердил Департамент экономического контроля при Государственном комитете по экономике и планированию Республики Беларусь.

Ксерокопию данного письма мы направили и Владимиру Миненку для сведения и использования в практической работе.

Кажется, все понятно, однако чиновник не унимается.

О. БОЛОБУЛИЧ,
директор малого предприятия «Верас».

АМІНЬ

У 1917 годзе Бог даў уладу бальшавікам, а ў 1991 годзе Бог адабраў уладу ў бальшавікоў. Бог сказаў: «Хопіць». І засталіся веруючыя без ЦК КПСС, сам на сам з сваімі думкамі, абманутымі надзеямі, кінутымі на волю лесу. Бальшавікі самі пабудавалі сваю дзяржаву, самі яе і разбурылі. Ну і слава Богу, што ўсё так закончылася.

Бог даў—Бог узяў.

Атэіст.

Партупея падцягнута, толькі ці будзе замена?

Групавы партрэт удзельнікаў мітынгу, прысвечанага гадавіне былога рэферэндуму па былому Саюзу можна было ахарактарызаваць коратка: год нараджэння—1917, дата ўступлення ў КПСС—1937.

У пару прагульваліся М. Таразевіч і А.Нікіценка з «Белай Русі», укормлены ветэран даказваў другому, што бацька Зянона Пазьняка паліцай, над усімі фашыстоўствала песня: «Браток, подтяни портупею и верь, что замена придет». Паверыць у тое, што замена прыйдзе, было вельмі цяжка, бо ў герояў мітынгу, акрамя плачу па мінуламу ды жадання яго вярнуць невядома якім чынам, акрамя праклянняў, нічога не было.

Адкрыў гадавіну памінання ўжо трошкі вядомы В. Афанасьеў, які займаецца сацыяльнай абаронай ваеннаслужачых. Той самы, што здзекваўся ў свой час з салдат, за што быў і пагнаны з арміі. Ён даў палітычную ацэнку моманту. Сутнасць выказанага заключалася ў тым, што Вярхоўныя Саветы, прэзідэнты рэспублік груба парушылі Канстытуцыю Саюза, давялі народ да жабрацтва, разбураюць, расцягваюць узброеныя сілы. «Мы павінны спыніць гэты разбуральны працэс, бо наша цярпенне не бязмежнае. Таму мы патрабуем ад Вярхоўнага Савета прыняць неадкладныя меры і рашэнні».

Затым прадаставілася слова старшаму лейтэнанту запасу (цяпер працуе ў лабараторыі аднаго з тэхнікумаў) т. Макараву. У яго прамове ўяўна адчуваўся ўплыў нядаўніх выступленняў В. Кебіча. «Першыя парушальнікі,—сказаў Макараў,—гэта самі заканадаўцы. Найвышэйшым праяўленнем беззаконня з'яўляецца СНД, створаны трымя ГК-пушчыстамі, сапраўдныя злачынцы не ў «Матросскай цішыні», а на волі. Ідэя суверынізацыі падкінута ім невыпадкова. Усе рабілася Захадам з мэтай расчляніць магутную дзяржаву СССР».

—Арміі нельга быць беспартыйнай,—сатрасаў паветра ветэран працы В. Казлоўскі.—Так званыя дэмакраты—гэта былыя партакраты. Яны парушылі законнасць, яны прадалі краіну і партыю...

Пасля знішчальнай крытыкі Вярхоўнага Савета Рэспублікі, чакалася, будзе лагічны заклік: «Далоў такі Вярхоўны Савет!» Але яго не было. Як выходзіць, аратар давярае здраднікам—ГК-пушчыстам.

Новаяўленая фракцыя (чаго і каму?) «Белая Русь» у асобе А. Нікіценкі і М. Таразевіч выступіла супраць беларускай мовы, якую адраджаюць нацыяналісты БНФ. «Не допустите,—аратарствавала апошняя,—чтоб ваши дети учились на литвинском языке. Ибо нет языка белорусского, как нет и такой нации. Все мы русские белорусы». Хочацца адзначыць, што аратарка, выступленні якой носяць падсудны характар, вельмі няграматна гаварыла «по-руськи».

—Калі мы не выратуем Расію, мы не выратуем сябе,—заклікаў растаптаны віцебскай партакратыяй, беспрацоўны, хоць і член ЦК партыі Жырыноўскага, В. Салоха.—Мы павінны будаваць Саюз у рускім разуменні.

—Для мяне не іграе ніякай ролі, хто жыве са мной побач: яўрэй ці ўзбек. Давайце ваяваць разам за светлае жыццё,—гаварыла Г. Харытонава.—Але да ўлады прыйшлі фашысты, такія, як БНФ. Мы аказаліся сыравінным дадаткам Захаду. Таму скажам: «Так, адзінай і нездзялімай узброенай сіле!».

Што ўзяць з савецкай інтэрнацыянальнай жанчыны, якая за дружбу, але толькі без беларусаў, бо БНФ у яе разуменні фашысты.

«Воинствующие старики», шчырыя, але няшчасныя ад сваіх перакананняў, дайшлі да экстазу. Не ведаю, што сказаў бы дэпутат гарсавета П. Бязлюдаў, але яны, пэўна, ведалі. Бо варта было апошняму падысці да мікрафона, як былая «честь и совесть эпохи» праявіла сваю выхаванасць і культуру, усе тое, на чым выхоўвала маладзейшых. Нібы сарваўшыся з ланцуга, яны закрычалі: «Фашыст! Сабака! Далоў!»

В. Афанасьеў высока ацаніў гэтую гвалтоўнасць: «Мяркуючы па рэакцыі,—сказаў ён,—вы на правільным шляху!»

Вось так. Самы раз усаджваць ветэранаў на танкі і выпраўляць аб'ядноўваць у Саюз і КПСС. Ды вось малавата іх нешта. Сотні тры, ды год нараджэння, паўтараю, семнаццаты. Самае ж галоўнае, замены не прадбачыцца. А інакш?.. Страшна падумаць, калі партупея падцягнута.

Вера АДРАДЖЭНСКАЯ.

ЗБОР ПОДПІСАЎ ЗА РЭФЕРЭНДУМ ПРАЦЯГВАЕЦЦА

Кто боится референдума

«...Иначе вызову милицию!»

По мере роста количества подписей за проведение референдума резко возрастает паника в рядах власть имущих.

На пути членов инициативной группы ими воздвигаются всевозможные барьеры с целью затруднить сбор подписей и, в конечном счёте, сорвать проведение референдума.

В сложной обстановке приходится работать членам инициативной группы города Витебска, о чём свидетельствует нижеприведённый документ, кстати, составленный в коридоре облисполкома. Тов. Рудой отказался назвать свою должность, не захотел в кабинете разговаривать и заявил: «Не мешайте работать, иначе вызову милицию!»

Его требование засвидетельствовать подпись члена инициативной группы в Городокском райисполкоме не основано на законе.

АКТ

от 10 марта 1992 года гор. Витебск

Составлен с участием члена инициативной группы референдума Павлова Михаила Владимировича, проживающего г. Витебск, ул. Терешковой, 26, корп. 4, кв. 73, свидетелей Хамайды Бориса Хононовича и Крощенко Александра Леонидовича в том, что по распоряжению ответственного работника облисполкома Рудого Александра Ивановича (свою должность назвать категорически отказался) управделами Октябрьского райисполкома было запрещено засвидетельствовать подпись члена инициативной группы Павлова М. В. на 74 (семьдесят четыре) листах с 354 (триста пятьдесят четыре) подписями, собранными в гор. Городке и районе Витебской области.

Свой отказ тов. Рудой мотивирует тем, что подпись члена инициативной группы необходимо засвидетельствовать в Городокском райисполкоме.

Член инициативной группы М. Павлов
Свидетель Б. Хамайда
Свидетель А. Крощенко
Должностное лицо Рудой

Должностное лицо от подписи отказался М. Павлов, Б. Хамайда, А. Крощенко.



Вытрымкі з Закона «Аб народным галасаваньні (рэферэндуме) у Рэспубліцы Беларусь»:

Артыкул 11: «...Завяраючыя подпісы старшыні і члена ініцыятыўнай групы засьведчваюцца пячаткай выканаўчага і распарадчага органа гарадскога, раённага ў горадзе, пасялковага, сельскага Савета народных дэпутатаў...»

Артыкул 43: «Асобы, якія перашкаджаюць шляхам насільля, падману, пагроз, подкупу або іншым шляхам свабоднаму ажыцьцяўленьню грамадзянамі Рэспублікі Беларусь іх права на ўдзел у рэферэндуме, а таксама службовыя асобы дзяржаўных або грамадскіх органаў, прадпрыемстваў, установ, арганізацый, члены ініцыятыўнай групы і камісій па рэферэндуму, якія ўчынілі падлог дакументаў, прыпіску, яўны няправільны падлік галасоў, парушылі тайну галасаваньня або дапусьцілі іншыя парушэньні гэтага Закона, нясуць устаноўленую законам адказнасць».

АТАКА НА ДЕМОКРАТИЧЕСКИЙ ПРОЦЕСС

Все последние месяцы со страниц «Віцебскага рабочага» и «Витьбичей» звучало подстегивание к атаке на демократов, велась их дискредитация. Особенную активность проявили Л. Саратокин и В. Афанасьев, «афганец-полковник», изгнанный из военной прокуратуры без права получения пенсии (депутат горсовета).

Эти «вожди» и организовали атаку на демократический процесс, которая состоялась по призыву «Віцебскага рабочага» 3 марта 1992 года в нашем городе. Инициаторы-депутаты разного уровня, члены подпольного обкома, которые болеют ностальгией по прошлому, те, которые хотят при помощи штыков вернуть КПСС, «дружбу народов», единую и неделимую, почему-то «русскую советскую власть». Паспортные белорусы были в восторге от своего сборища, которое на следующий день на пресс-конференции Станислав Шушкевич назвал абсурдным и противозаконным.

Кто там был, уже поведал людям Л. Саратокин, назвав почему-то абсурдность гражданским мужеством («Віцебскі рабочы» № 37). Однако, каждый мыслит в силу своего ума. Но тот, кто предвидит последствия, не может не расценить все это, как обыкновенную жиринофрению.

Что можно взять, когда тон задают такие деятели, как «старик-ветеран», что попытался сорвать недавнее выступление в Витебске Зенона Позьняка. Бывший стрелок-спортсмен ретировался из Литвы, а сейчас носится в Витебске, создавая свою партию и программу государственного обустройства. Он представляется то фермером на селе, то инженером-механиком, которого нет на заводах, то распродает газетки, призывающие к свержению демократов. Нашим коммунистам он пришелся по душе. Ведь не зря А. Александренок проводит работу в армии, на которую собираются опереться как витебские жириновские, так и сам Владимир Вульфович.

Сторонники объединения в Союз вещают о массовой распродаже великой Родины, мол 60% сырья из нее вывозится за так, а В. Кебич, который был в Витебске на встрече с офицерским составом, вещал иначе: Россия распадается, она сама вынуждена будет ввозить нефть и другое сырье из-за границы. Кому верить?

Тот же В. Кебич говорил, что за рюмкой совершен переворот в состоянии эйфории. Так появились ГК—пущисты. Достаточно было одной роты десантников, чтобы предотвратить это, но никто не соблюдал законность.

Почему-то увиделось во всем этом совпадение интересов Кебича и сторонников объединения в Союз, хотя Кебич на съезд СССР, сказал, не поедет. Но поехать собрались другие, а не выйдет —принять всех в Витебске, поскольку получены заверения, что командование воинской части десантников возьмет этот съезд под охрану.

В этом материале только предыстория, и я, как автор, анализирую все, что предшествовало годовщине бывшего референдума по бывшему СССР и вижу: болел мой город жиринофренией. Собирались партийные саратокинско-афанасьевские депутаты, приезжал на встречу с военными В. Кебич, а город собирал референдумные подписи за отставку и В. Кебича, и его депутатов.

Видно, и впрямь нашему Витебску выпала участь, если не оставить след в истории, то хотя бы наследить. А грязно ли, кроваво ли? Свидетелем будет время.

Г. КРИСТИ,
координатор консультативного совета демократических партий и движений г. Витебска.

ДЛЯ НАЧАЛЬНІКАЎ — ЗЯЛЁНАЕ СВЯТЛО

Як грыбы, растуць у Лепельскім раёне дачы. Забудоўваюцца вёскі — прыгажуні Окана, Бяленіца і іншыя, узводзяцца дабротныя будынкі за параўнальна кароткі тэрмін. А ў гэты ж час у магазіне «Будаўнічыя матэрыялы» каля тысячы чалавек марнуюцца ў чарзе.

Чаму ж усё знаходзіцца для асобных людзей? Гэтае пытанне даўно абурала людзей. У мінулым годзе па праблемах размеркавання і продажу будматэрыялаў на прыёме ў гарвыканкоме пабывала 17 чалавек, паступіла больш 500 пісьмаў, заяў, сярод якіх нямала скаргаў на разбазарванне фондавых матэрыялаў, парушэнні сацыяльнай справядлівасці.

Такія факты былі ўстаноўлены і камісіяй гарвыканкома, а таксама выпадкі злоўжывання службовым становішчам асобнымі кіраўнікамі, праяўлення асабістай нясціпласці, якія выклікаюць справядлівыя скаргі людзей. Вось факты, якія былі прыведзены на пасяджэнні гарвыканкома: амаль усе кіраўнікі Лепельскай МПМК-75 скарысталі службовае становішча і набывалі будматэрыялы яшчэ па нізкіх цэнах. Сярод іх намеснікі начальніка Г. Фёдараў і В. Аношка, начальнік планавага аддзела Г. Гурыновіч, ды і сам кіраўнік гэтай арганізацыі В. Цярэшчанка ў рэкордна кароткі тэрмін пабудаваў уласны дом.

Нямала і іншых прыкладаў, калі ў арганізацыях прадаваліся будаўнічыя матэрыялы пабочным асобам, і далёка не радавым. На буйныя сумы зрабілі «пакупкі» галоўны інжынер ПМК-24 В. Карповіч, старшыня народнага суда Лепельскага раёна Г. Лісуноў, намеснік начальніка міліцыі Г. Варанько. Асаблівую ж нясціпласць праявіў начальнік ДБУ-34 П. Браслаўскі: у зводным рэестры налічваецца 31 дакумент на набыццё ім матэрыялаў для будаўніцтва дачы ў в. Окана.

Гарвыканком прыняў рашэнне хадайнічаць перад абласнымі арганізацыямі аб разглядзе пытання мэтазгоднасці прабывання на займаемых пасадах асабліва нясціплых начальнікаў. Як вырашыцца гэта пытанне?

... А пісьмы па злабадзённай праблеме працягваюць ісці. Народ называе імёны ўсё новых «герояў» Лепельскай дачнай эпапеі.

Лявон СЛІВА.

Пісьмы ў рэдакцыю ✦ Пісьмы ў рэдакцыю ✦ Пісьмы

По ком тоскуют «Витьбичи?»

Хотя до охотничьего сезона еще далеко, повсеместно летают коммунистические утки типа: «Вот до чего довели демократы» или «Демократы рвутся к власти». Выпускают их не только темные полуграмотные люди, но и дипломированные журналисты.

Дорогие витебляне, давайте рассуждать здраво! Вспомните, как 20 августа беззащитные и безоружные витебские демократы вышли под амбразуры обкомовских окон на площадь Свободы. О какой власти они думали тогда? А ведь люди в те дни, зная кровавую хватку лжекоммунистов, думали, что путч—на годы.

Кто, как не демократы, в те дни готовы были пойти за решетку ради свободы нашего народа?

А разве может умный человек верить утке, что демократы развалили экономику? Разве не «бывшие» коммунисты и их ставленники заправляют законами и «базами» по сей день?

Так скажите, пожалуйста, в чем сегодня можно обвинять демократов?

Ан, нет! Тулиновы, костюкевичи, никитенко и другие все никак не уймутся: все льют свою мутную воду на мельницу затаившейся партократии, лишенной, благодаря демократии, своих гнезд.

Сколько демагогической пустоты и нечистоплотности накопилось в головах тех горе-журналистов, которые до сих пор не поняли всей чудовищности так званого «коммунистического режима», который обескровил, раскрестьянил и деградировал нашу многострадальную Родину.

Конечно, бывшим секретарям и чинушам КПБ было что терять: это и дачи с машинами, и беспредельная власть над миром без всякой ответственности. Понятно, за что они так люто ненавидят демократов. Они с каждым днем, находясь под пристальным присмотром демократов, теряют рычаги своей незаконной власти, а грядущие перевыборы грозят раз и навсегда перерезать пуповины всем их блатам и связям.

Труднее понять витьбичевскую журналистскую братию! Ведь почти в каждой строчке их продукции есть подтекст с подколкой демократов и воющая тоска по уходящим временам.

Невозможно понять, чего они жаждут, может быть надеются оттяпать себе жирные кусочки в затянувшемся периоде партприхватизации? А, может быть, после возврата большевиков им будут уготованы райские места в партийной прессе? Какая-то разгадка в их непонятном поведении должна быть!

Больше всего меня удивляет спокойное поведение депутатского корпуса—учредителя этой газеты, которая изумляет своим резко правым креном уже не только витеблян.

Поведение «Витьбичей» все чаще и чаще напоминает горожанам, что подавляющая часть городских депутатов «взяла власть» под патологически красными знаменами КПБ—КПСС. Вряд ли они будут радеть о благосостоянии жителей города, скорее всего они будут искать ноев ковчег для себя и номенклатуры, чтобы через три года быть победителями среди рыночной стихии.

А. КОРЧЕВСКИЙ,
член БНФ с 1988 года.

В ПОИСКАХ «ВЫБОРА»

В киосках не всегда купишь «Выбор». Сообщите, как подписаться на вашу газету.

Александр.
211350, г. п. Бешенковичи.

Уважаемый Александр!

Газета «Выбор» зарегистрирована как еженедельное республиканское издание. Но из-за финансовых трудностей мы выходим два раза в месяц и не можем организовать подписку. По этой причине «Выбор» поступает в киоски «Союзпечати» в ограниченном количестве. Например, в Бешенковичи высылается только 30 экземпляров нашей газеты. Редакция намерена продолжить работу по увеличению тиража.

Петр СИНЯВСКИЙ,
ответственный секретарь газеты «Выбор».

Не дайте себя обмануть снова

Знаю зарубеж не только по кинофильмам и телевидению. Сделал давно открытие: самые счастливые, самые независимые и самые обеспеченные люди на Западе—это пенсионеры.

Присмотритесь: в Италии, Греции, Швеции, США и других государствах к пассажирам туристских автобусов и теплоходов. Почти все они—пожилые люди. Поработали хорошо в свои годы—теперь наслаждаются жизнью.

Еще убедительный пример. Он из жизни наших бывших витеблян, уехавших в Израиль. Абсолютно все в порядке в той семье, переселившейся на землю обетованную, если она имеет пенсионера. Более молодым там трудно сразу устроить себе жизнь, и их содержат бабушка или дедушка за счет своей пенсии.

А наша ленинская система? В отличие от развитых капиталистических стран, она не может гарантировать стабильную ухоженную старость. Наоборот, случись неладное, так вынуждены расплачиваться старики. И нынче, больше всех страдают ветераны, особенно низкооплачиваемые. Им не на что поесть, одеться. Не раз им приходилось быть бесправным орудием в руках номенклатуры, и сейчас она использует стариков, особенно бывших участников войны, в нападках на демократию!

Бедные наши дедушки и бабушки! Очнитесь, ничего светлого у вас не было, кроме горя. Вы же не знаете, что значит—хорошо жить! Да, вы защищали Родину, но вместе с ней и своих хозяев—номенклатуру. А у нас еще истинной демократии нет. Даже ее молодые побеги стараются задушить вашими же руками. Опомнитесь, оглянитесь на десятки миллионов жертв социализма и во имя истинного светлого будущего Беларуси, а значит и своих внуков, помогите ей пойти по пути западных развитых стран!

И. НЕЛИДОВ.

ЖАЛОБА НА ГОСПОДИНА СВОЕГО

После знакомства, многократных встреч и бесед в колхозе «Богушево» Полоцкого района с председателем колхоза «Кировский» Витебского района тов. Лемешевой Н. В. я поддалась уговорам и переехала в ее колхоз на должность заведующей зверофермой.

Через короткое время на ферму звероводом перевели сына Лемешевой Н. В.—Сашу. Сын председателя не имел специального образования, и в то время я не знала, что он обошел все должности в колхозе.

Когда я увидела его отношение к работе, после неоднократных бесед, которые не дали результатов, я написала докладную на правление.

Сразу после возвращения Лемешевой Н. В. из Москвы, в связи с ликвидацией Верховного Совета СССР, она резко изменила отношение ко мне: перестала замечать!

Делала неоднократные попытки встретиться с Лемешевой Н. В. или попасть к ней на прием, но тщетно.

Меня вынудили написать заявление на увольнение. Но я до сих пор не уволена и расчет не получила!

Горе объединяет людей, ко мне стали приходить члены нашего колхоза. Они хотят знать, кому и для какой цели строят трехэтажный особняк, сметная стоимость которого на январь 1991 года была 250 тысяч?!

Людей интересует, как могло случиться, что колхозный шофер Горошко угнал колхозную машину «Волгу», шесть месяцев отсутствовал, теперь возвращен на свое место и не понес никакого наказания...

Уважаемая редакция! Мы рассчитываем, что со страниц вашей газеты люди узнают, как оставшиеся у руля государственные мужи и власть имущие ведут себя, что делают, и не пора ли показать им их место в жизни.

Ждем и надеемся!

Заведующая зверофермой
Г. КЛИННИКОВА.

ОТ РЕДАКЦИИ. Хотя в редакции не все относятся с уважением к жалобам, особенно к тем, которые вызваны причинами личного характера, в этой звучат серьезные обвинения в адрес известного руководителя менее известного колхоза. Посему было решено углубиться в лабиринты нашей агросистемы и попытаться извлечь истину для людей, дабы ее светом озарить им путь в будущее.

В самом начале для авторов этих строк главным было решить вопрос, какую истину для подателей жалобы добывать: колхозную или общечеловеческую. Пусть не воспримется это кем-то поигрыванием словами. Ведь по общечеловеческим понятиям ну никак не может одно и то же лицо, к примеру, помешивать поварешкой суп гороховый и управлять государством, или наслаждаться чудесным театрализованным исполнением песенки «Все хорошо, прекрасная маркиза» и в то же самое время самому петь, к примеру, гимн Советского Союза.

К нашему горькому разочарованию, в беседе с главным инженером колхоза «Кировский» С. Шаньковым выяснилось: истину надо добывать колхозную. Сие означает, что податели жалобы за колхозный строй, но при хорошем царе-председателе, чего в природе быть не может.

Что ж, удел наш всех такой: жить, не очень забегая наперед советской действительности, а утешение: каждому фрукту свое время.

Публикуя в сокращенном варианте эту жалобу, редакция преследует одну важную цель: помочь колхозникам глянуть на себя со стороны и разобраться, кто они на этой земле, где работают. Если хозяева, то почему и от кого возможны обиды и притеснения, унижающие человеческое достоинство, вынуждающие тратить силы и время на доказательство своей правды через высшие инстанции.

Если рабы... то возможно ли это: жалоба на господина своего!...

По нашему мнению, именно это нежелание быть рабом, подчиняться людям, не всегда достойным, вынуждает наших первых фермеров вести неравную борьбу с агросистемой за право на свободный труд.

Словом, коллектив редакции искренне сожалеет, что еще одна группа колхозников вступила не на тот путь борьбы за свои честь и достоинство, но, тем не менее, опубликовав жалобу, надеется на торжество истины и при этом на помощь самих колхозников, которые, по словам одного из авторов жалобы, «боятся выступить открыто против произвола и насилия».

Жизнь собачья

Пусть стоит Демон

Пусть стоит на городской площади Демон с протянутой рукой. Не ведал он, что творил. Пусть он возвышается в своей черноте и напоминает о телячьем восторге, с каким мы шли мимо него и пели на праздничных демонстрациях.

Пусть заставит нас вспомнить, как несли мы по улицам портреты членов Политбюро—верных ленинцев и наших благодетелей, а потом замачивали праздники дешевой водкой и оставляли за собой бутылки и мусор на улицах и в подъездах домов.

А. ТОППЕН.

ў рэдакцыю ✦ Пісьмы ў рэдакцыю ✦ Пісьмы ў рэдакцыю

ВЯЛІКІ БЕЛАРУС ВІТАЎТ

Яшчэ ў дзяцінстве прачытаў кнігу Генрыка Сянкевіча «Крыжаносцы». Нізка схіляюся перад пераможцамі ў Грунвальдскай бітве. Гэта быў подзвіг славянскіх харугваў.

Я сам беларус, але ж толькі параўнальна нядаўна даведаўся, што герой Грунвальда князь Вітаўт мой зямляк. Чаму ад мяне і маіх дзяцей хавалі нашу гісторыю? Каму гэта трэба было?

Дзякуючы мужнасці беларускіх змагароў і асабіста князя Вітаўта, Польшча і Вялікае княства Літоўскае пазбавіліся ад пагрозы з Захаду, а Жмуць зноў увайшла ў склад нашай дзяржавы.

У рэспубліцы нават няма помніка нашаму вялікаму беларусу.

Ды што казаць пра помнік.

Няма сапраўднага падручніка па гісторыі Беларусі. А мы яшчэ гадаем, чаму гэтак абыякава адносяцца ў нас да беларускай мовы, да народных традыцый.

Прапаную рэдакцыі малюнак мастака С. Харашаўцава «Князь Вітаўт». Як добра, што ёсць людзі, якія любяць сваю нацыянальную гісторыю і культуру.

С. ПОЛЦЕЎ.

Ці патрэбен такі сцяг

Талачынская раённая газета «Сцяг Ільіча», бадай адно з нямногіх перыядычных выданняў Віцебскай вобласці, якое да гэтага часу не памяняла сваю назву. Журналісты «раёнкі» ўсё яшчэ нясуць той чырвоны ленінскі сцяг, на якім кроў мільёнаў нявінных чалавечых ахвяр. Невыпадкова, што ў Талачыне так горача выступілі ў падтрымку ГКЧП.

Праўда, спроба памяняць назву газеты была. Збіраліся прапановы чытачоў на прадмет новага загалоўка. Аднак, на сесіі раённага Савета народных дэпутатаў пытанне, як кажуць, заблакіравалі. І ці трэба здзіўляцца: старшынёй райсавета тут ні хто іншы, як былы першы сакратар былога райкома КПБ І. С. Шчурок, які і зараз сядзіць у тым жа сваім кабінеце, у тым жа крэсле, што і ў бытнасць першым.

Мясцовыя журналісты на чале з рэдактарам А. Д. Арлоўскім верна яму служаць, стараюцца ва ўсім дагадзіць, бо сваёй цвёрдай пазіцыі на падзеі сённяшняга дня не маюць. То яны бэсцілі дэмакратаў у асобе Б. Ельцына, З. Пазняка і іншых, перадрукоўваючы па ўказцы кіраўнікоў былога раённага партыйна-наменклатурнага апарату публікацыі гэтага плану з цэнтральных і рэспубліканскіх газет. То зараз з нумара ў нумар ідуць нейкія журботныя развагі з нападкамі і на верхаводаў былой камуністычнай партыі, і на цяперашніх дэмакратаў.

Не робіць гонару мясцовай газеце і бессаромны падман чытачоў. Так, у перыяд мінулай падпіснай кампаніі «Сцяг Ільіча» ў нумарах за 16 і 23 кастрычніка адзначаў, што «друкаваць газету будзе на чым», «збояў не чакаецца, папера ёсць», бо падпісана пагадненне з Санкт-Пецярбургскай картонна-папяровай фабрыкай на пастаўку ў лістападзе 50 тон паперы, а гадавая ж патрэбнасць яе на выпуск «раёнкі» складае прыкладна 15 тон.

У нумары за 26 кастрычніка ў заметцы «Дзякуй за дапамогу» чытаем: «40 тон бульбы ў абмен на 50 тон паперы, прызначанай для друкавання «Сцяг Ільіча», адпраўлена днямі з раёна ў горад Санкт-Пецярбург. З пахвалой называліся мясцовыя гаспадаркі, якія выдзелілі сваю прадукцыю для бартэрнай здзелкі».

Чытачы паверылі рэдакцыі, хаця да гэтага было сумненне: замест абяцаных па падпісцы трох нумароў у тыдзень атрымоўвалі іх летась толькі два... Адным словам, падпісаліся на «Сцяг Ільіча» на сёлетні год амаль 7 тысяч чалавек, што і трэба было журналістам.

Але, як кажуць, абяцанка-цацанка, а дурному радасць... Аказалася, што ўсё не што іншае, як лапша на вушы. З нумара за 22 лютага г. г. чытачы даведаліся, што з-за дэфіцыту бюджэту газета будзе выходзіць толькі... адзін раз у тыдзень, што на паперу, маўляў, «днямі прыйшлі новыя расцэнкі—ад 20 да 30 тысяч» (маецца на ўвазе за тону).

Так і не даведаліся чытачы, куды ж дзеліся тыя закупленыя 50 тон паперы. Можа журналісты спадзяюцца на забыўлівасць падпісчыкаў?

Многія талачынцы цяпер усё больш і больш схіляюцца да думкі: ці трэба ім такая газета, якой ужо не вераць? Ці патрэбен ім такі сцяг, як «Сцяг Ільіча»?

А. ДУДКІН.

Што аб нас пішуць

Землякі не забываюць

У лютаўскім нумары канадскае газеты беларускіх ветэранаў «Зважай» змешчана вялікая й падрабязная інфармацыя сп. Ул. Скрабатуна аб навукова-практычнай канферэнцыі па гісторыі і краязнаўству горада Глыбокага і раёну, што адбылася 17-га верасня.

Юрась ТУТЭЙШЫ.

Нам пішуць з Замежжа

Канфедэрацыя Незалежнай Польшчы
Палітычны аддзел
Варшава, 14 лютага
Рэдакцыя «Выбар»

Шаноўны Пан Рэдактар!

Дасылаем Вам матэрыялы аб праграме КНП, найстарэйшай існуючай у Польшчы палітычнай партыі, якая мае 51 дэпутата ў Сейме РП.

Мы просім Вас рэгулярна прысылаць экземпляр Вашае газеты. У замен абяцаем стала пасылаць матэрыялы КНП.

Наша просьба вынікае з ацэнкі намі важнасці нацыянальных рухаў краін Цэнтральна-Усходняй Еўропы для Польшчы дый усяе Еўропы. Мы заўсёды падтрымлівалі імкненне нацый, паняволеных бальшавікамі, да стварэння незалежных дэмакратычных дзяржаў. Ахвотна гэтаксама возьмем удзел на пачынах Вашага выдання ў публіцыстычнай дыскусіі па праблематыцы Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і стасункаў Вашае краіны з Польшчаю.

З павагаю Томаш **ШЧЭПАНЬСКІ**, кіраўнік рэферата «Міжморʼе» у Палітычным аддзеле КНП.

(Даведку пра Канфедэрацыю незалежнай Польшчы чытайце на 6 старонцы).

Жыццё, як яно ёсць

Плакалі нашы грошыкі

Калі праязджаеш ці ідзеш каля касцёла ў г. Талачыне, у вочы кідаюцца глыбокія траншэі з металічнай арматурай. Тут на працягу апошніх гадоў вялася рэканструкцыя гэтага будынка пад гісторыка-краязнаўчы музей. Работы выконваў кааператыў «Інтэкс», створаны пры былым рэспубліканскім міністэрстве Дзяржзабеспячэння. Работнікам названага кааператыву ў парадку першачарговай субсідыі раён пералічыў звыш 650 тысяч рублёў, з іх ужо было асвоена 414.472 рублі.

На сесіі раённага Савета народных дэпутатаў, якая адбылася ў снежні мінулага года, дэпутаты паставілі пытанне аб мэтазгоднасці працягу будаўніцтва гісторыка-краязнаўчага музея і мемарыяльнага комплексу. На гэта былі свае прычыны: па-першае, работам, як кажуць, канца-краю не відаць, ды і грошай яшчэ шмат трэба, а, па-другое, вернікі—католікі сталі патрабаваць перадачы ім касцёла для рэлігійных абрадаў.

Стварылі дэпутацкую камісію, якой даручалася дасканала вывучыць справу, унесці канкрэтныя прапановы на чарговую сесію, што і было зроблена. На сесіі раённага Савета, якая адбылася ў канцы лютага, было прынята рашэнне спыніць далейшыя работы па аднаўленню і рэканструкцыі былога касцёла пад музей, перадаць гэты будынак веруючым католікам. Вырашана прыняць неабходныя захады па вяртанню кааператывам «Інтэкс» нявыкарыстаных грошай. Толькі вось пытанне: ці ўдасца зрабіць гэта?!

Як кажуць у народзе, плакалі нашы грошыкі. Як-ніяк, а звыш 400 тысяч рублёў выкінуць на вецер з казны раёна. Калі ўжо музей не стварылі, то хаця б прывялі ў боскі выгляд будынак касцёла. Дык не ж...

А вось яшчэ адзін выпадак марнай працы дзесяткаў тысяч народных сродкаў. Газета «Віцебскі рабочы» паведамляла ўжо аб неапраўданым спыненні на пэўны час работ на будаўніцтве раённай бальніцы ў Талачыне. Як стала вядома, з-за недагляду службовых асоб мясцовай МПМК-65 на аб'екце замарозіліся і прыйшлі ў непрыгоднасць батарэі паравога ацяплення. Цяпер у тэрміновым парадку вядзецца іх замена. Колькі грошай зноў выкінута на вецер—каля ста тысяч, калі не болей!

У даных выпадках крыюцца не толькі значныя матэрыяльныя, але і вялізныя маральныя выдаткі. То талачынцы зараз толькі і гавораць пра гэтыя абураючыя факты, якія яшчэ раз яскрава сведчаць аб памылковасці многіх рашэнняў нашых кіраўнікоў, неахайнасці і безадказнасці іх.

Алесь МАЗУР.

Два тэзісы нацыянальнай дэмакратыі

Нацыянальныя дэмакраты ці нацдэмаўшчына —гэта тэрмін, які ўзнік на Беларусі ў 20-я гады і быў на доўгі час зьвязаны з шматлікімі справамі аб «ворагах народу». У «нацдэмаўшчыне» тады абвінавачваліся многія беларускія навукоўцы, дзяржаўныя дзеячы і шмат іншых простых грамадзян. Пры гэтым пад тэрмін «нацдэм» падпадалі і былыя дзеячы Беларускай сацыялістычнай Грамады (БСГ) і хрысьціянска-дэмакратычнага саюзу, беспартыйныя і нават камуністы. Сярод іх былі такія вядомыя людзі, як Ігнатоўскі, Доўнар-Запольскі, Лёсік, Ластоўскі, Цішка Гартны і многія іншыя. Самае дзіўнае, што хаця ярлык «нацдэм» насілі самыя розныя людзі—ні адзін з іх не належаў да арганізацыі, якая б мела адпаведную назву. Была сацыял-дэмакратыя, хрысьціянская дэмакратыя, быў нават нацыянал-сацыялізм—а нацыянальнай дэмакратыі, як філязофскай ці палітычнай плыні ня было! Толькі адна нітачка вядзе да гістарычнага абгрунтавання такой назовы. Маецца на ўвазе партыя нацыянальна-дэмакратычны саюз, якая існавала ў Польшчы з 1897 г. па 1917 г. Магчыма гэтая назва нейкім чынам і паўплывала на назву беларускіх «нацдэмаў» даваеннага перыяду.

Толькі зараз, на пачатку 90-х гадоў, было вырашана стварыць сапраўдную, нацыянальна-дэмакратычную арганізацыю. 23—24-га чэрвеня 1990 году ў г. Менску адбылася ўстаноўчая канферэнцыя Нацыянальна-дэмакратычнай партыі Беларусі (НДПБ). На гэтай канферэнцыі ўпершыню ў гісторыі Беларусі была ўтворана партыя, якая аб'ядноўвае тых, хто дбае аб лёсе шматпакутнага беларускага народу, змагаецца за нацыянальнае адраджэнне, вяртаньне беларусам гістарычнае памяці, роднае мовы, культуры і рэлігіі.

Сярод існуючых дэмакратычных партыяў НДПБ займае асаблівае становішча. Я спынюся на дзвюх істотных рысах ідэялогіі нашае партыі.

Па-першае—НДПБ гэта НАЦЫЯНАЛЬНАЯ дэмакратычная партыя. Што гэта значыць? У дзяржавах, якія ніколі не былі ў складзе імперыі, ці даўно пазбавіліся імперскага ўціску, пытаньне аб такіх структурах, як НДПБ, не стаіць. Большасць заходніх дзяржаваў зьяўляюцца монанацыянальнымі і пытаньне аб выратаваньні карэннае нацыі там ня існуе. У выпадку беларусаў, якія жывуць за межамі былога Саюзу, толькі ў Польшчы на Беласточчыне мясцовыя беларусы адчуваюць на сабе вялікі асіміляцыйны ўплыў з боку палякаў. Вось у гэтай сітуацыі і назіраюцца працэсы, аналагічныя тым, якія існуюць у Рэспубліцы Беларусь: як абаронца адраджэньня беларусаў на Беласточчыне ня так даўно там створана Беларускае дэмакратычнае аб'яднанне (БДА).

Зьяўленьне Нацыянальна-дэмакратычнае партыі Беларусі абумоўлена ў пачатковы перыяд дзейнасьцю на ніве беларускага адраджэньня Беларускага народнага фронту, а затым—імкненьнем асобных, адданых беларускай справе, людзей да стварэньня больш жорсткай, чым у БНФ, структуры для барацьбы за выратаваньне беларускай нацыі. Магчыма мы «апошнія з магікан» нацыянальна сьвядомыя беларусы.

Нацыянальны нігілізм, прарасейскія настроі большай часткі насельніцтва, масавы манкурцізм—вось што характарызуе сучаснага пашпартнага беларуса. І ня дзіва, што ў беларускіх партыях дэмакратычнае арыентацыі, якія ўтварыліся сьледам за БНФ, а потым аб'ядналіся ў Аб'яднаную дэмакратычную партыю (АДПБ) нацыянальная ідэя стаіць на заднім плане. Іх галоўная тэза сьвярджэньне таго, што перш за ўсё для людзей патрэбны сацыяльныя зьмены і паляпшэньне эканомікі і толькі потым, калі будзе пабудавана новая дэмакратычная беларуская дзяржава, толькі тады яны «соизволят» прыступіцца да нацыянальных пытаньняў.

РБ—адзіная суверэнная дзяржава, у якой амаль не гучыць дзяржаўная, беларуская, мова. РБ—адзіная дзяржава, парламент якой на сесіях карыстаецца расейскай мовай замест роднай. У нас вельмі яскрава праяўляецца наступны закон: сіла рэакцыйнасьці ўраду дзяржавы адваротна прапарцыянальна нацыянальнай сьвядомасьці народу, які насяляе гэтую краіну.

Таму зразумела наша, нацдэмаў, глыбокае перакананьне, што шлях да новага грамадства ляжыць праз нацыянальнае адраджэньне, праз выхаваньне сьвядомага беларуса, які не саромеецца роднай мовы, а ганарыцца ёю, які ўслаўляе сваю гісторыю ды беражэ свой родны край. «Чыстыя» ж дэмакраты не маюць нацыянальных каранёў, няма гістарычнай неабходнасці ў іх місіі, яны для нас прышлыя.

Другой асаблівасьцю ідэялогіі, на якой грунтуецца НДПБ, зьяўляюцца яе адмоўныя адносіны да спрадвечных мрояў чалавека аб камуністычным раі, адмоўныя адносіны да сацыялістычнага шляху разьвіцця чалавецтва. Неабходна аднак адзначыць, што напачатку нашых ідэялагічных пошукаў, мы зьвярталіся да традыцый Беларускай сацыялістычнай Грамады пачатку XX стагодзьдзя. Людзі ўжо адчулі на сваёй скуры сапраўдную сутнасць ленінскіх лозунгаў. Мы імкнуліся да агульнай роўнасьці і атрымалі самую жахлівую няроўнасць, схаваную пад словамі аб «развитом социализме», «обновленном социализме», нават «социализме с человеческим (!?) лицом». Другіх слоў прачытаць мы не маглі, бо партыйная камуністычная мафія пільна сачыла, каб людзі не чулі праўдзівага слова, і не марудзіла саджаць за краты іншадумцаў.

Але настаў час, калі людзям пачалі адкрываць праўду аб сталінізме, надыдзе чарга і да ленінізма, і не за гарамі час, калі грамадства зразумее, што марксізм—гэта ўсяго толькі міф. А міфы і рэальнае жыццё—розныя рэчы.

Пара ўжо адкрыта прызнацца, што мы памыляліся ўсе 74 гады пасьля Кастрычніцкай рэвалюцыі, а двухсотгадовая эвалюцыя камуністычных ідэй, пачынаючы ад французскай рэвалюцыі, дала бясплодныя парасткі і прывяла іх да пагібелі.

Задача НДПБ—вярнуць беларускаму народу спрадвечныя, тысячагодзьдзямі выпрацаваныя сацыяльныя ісьціны.

А. АСТАПЕНКА,
старшыня Вышняе Рады НДПБ.

Кто есть кто?

Беларуская сацыял-дэмакратычная Грамада утворана 2 сакавіка 1991 г. У Віцебску пярвічныя арганізацыі БСДГ 10 сакавіка 1991 г. аб'ядналіся ў гарадскую філію. Зараз у Віцебскай арганізацыі БСДГ на ўліку 27 сябраў партыі. З іх ліку 2 народныя дэпутаты гарадскога Савета, тры кандыдаты эканамічных навук, пяць сябраў маюць сярэднюю адукацыю, а астатнія вышэйшую.

На здымку: старшыня Віцебскай гарадской філіі, начальнік планавага аддзела в/а «Маналіт», кандыдат эканамічных навук Уладзімір Рыгоравіч Дубавец. Яму 60 год.

У абарону міліцэйскай сям'і

БЕССАРДЭЧНАСЦЬ

мясцовых улад да асірацелай сям'і чарнобыльскага ліквідатара

Старшы сяржант міліцыі Мікалай Скрыпут памёр пры дастаўцы правапарушальніка ў дзяжурную часць Талачынскага РАУС. Смерць напаткала яго роўна праз два гады пасля Чарнобыльскай катастрофы, у ліквідацыі вынікаў якой Мікалай Міхайлавіч прымаў непасрэдны ўдзел. У экспертным заключэнні, атрыманым удавой Людмілай Вячаславаўнай Скрыпут з Мінскага навукова-даследчага інстытута радыяцыйнай медыцыны, так прама і запісана: «Абвастрэнне латэнтна працякаючага захворвання звязана з работамі па ліквідацыі вынікаў аварыі на ЧАЭС».

Ён быў узорным работнікам аховы правапарадку, старшы сяржант Скрыпут, аб чым яскрава сведчаць знак «Выдатнік міліцыі» і медаль «За 10 гадоў бездакорнай службы», якія бераглівa захоувае Людміла Вячаславаўна. Ён проста не мог не адклікнуцца на бяду, якая вясной 1986 года абрынулася на беларускую зямлю. Ён быў у першай групе работнікаў міліцыі, якія паспяшаліся з Талачына ў Чарнобыльскую зону адсялення.

Мінулі гады. Урад Рэспублікі Беларусь прыняў закон «Аб сацыяльнай абароне грамадзян, якія пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС». У ім, гэтым законе, чорным па беламу напісана аб

(Заканчэнне на 8-й стар.).

Даведка пра КНП

Канфедэрацыя незалежнай Польшчы—першая антыкамуністычная партыя правага накірунку, што ўзнікла напрыканцы 70-х гадоў пасля пратэстаў у Радаме. Займала адно з вядучых месцаў у апазіцыйным руху. Праводзіла шырокую прапаганду і акцыі супраць таталітарнае улады. Напрыклад, увосень 1989 маладзёжныя арганізацыі КНП занялі каля 120 будынкаў, прыналежных ПАРП.

Зараз КНП працягвае адыгрываць важную ролю ў польскай палітыцы, мае моцны ўплыў у Сейме РП. Лідэр партыі—Лешэк Мачульскі (нар. у 1930)—лічыць місіяй Канфедэрацыі «дасягненне незалежнай дэмакратычнай і справядлівай Рэчы Паспалітай, а затым таго, каб найлепей яна дазваляла рэалізаваць патрэбы ды імкненні грамадзянаў і грамадства». КНП жадае стварыць шырокі Незалежнецкі Лагер, і яшчэ больш вялікі—Дэмакратычны Саюз усіх груповак, якія бачаць неабходнасць актыўных зменаў.

У геапалітычным плане партыя выступае за палітычны блок былых сацкраін «Міжмор'е», які будзе процівагай Расіі і яе азіяцкім васалам, а таксама моцнай Нямеччыне.

В записную книжку активиста партии коммунистов Беларуси

«Если не будут приняты героические меры, я лично буду проводить в Совете Обороны и ЦеКа не только аресты всех ответственных лиц, но и расстрелы. Недопустимы бездеятельность и халатность. С коммунистическим приветом

ЛЕНИН.»

16.08.20. ПСС, т. 51, с. 216.

«Добавить: расстрел за неразрешенное возвращение из-за границы... Надо расширить применение расстрела... Основная мысль, надеюсь, ясна: открыто выставить принципиальное положение, мотивирующее суть и оправдание террора, его необходимость, его пределы.

Суд должен не устранить террор, а обосновать и узаконить его принципиально».

Ленин. 07.05.22. ПСС, т. 45 с. 189.

«Надо пойти на всякие уловки, хитрости, нелегальные приемы, умолчание, сокрытие правды, лишь бы вести во что бы то ни стало коммунистическую работу».

Ленин. Апрель 1920 г. ПСС, т. 4, с. 38.

«Школа должна стать орудием диктатуры пролетариата, т. е. не только проводником принципов коммунизма вообще...»

Ленин. Проект программы РКП/б/. 1919 г. Сочинения, т. 29, с. 112.

«Пролетариат гигантские жертвы принес для военных задач, на которые пришлось отдать десятки миллионов крестьян...»

Ленин. Московская губернская конференция РКП/б/. 22. 11.20. ПСС, т. 42, с. 32-33.

«Точно определить, что владельцы хлеба, имеющие излишки хлеба и не вывозящие их на станции и в места сбора и ссыпки, объявляются «врагами народа» и подвергаются заключению в тюрьме на срок не ниже 10 лет, конфискации всего имущества и изгнанию навсегда его из общины...»

Ленин. Основные положения декрета о продовольственной диктатуре. 08.05.18. Сочинения, т. 27, с. 321.

«Но крестьяне далеко не все понимают, что свободная торговля хлебом, что свободная торговля есть государственное преступление. «Я хлеб произвел, это мой продукт, и я имею право им торговать»,—так рассуждает крестьянин по привычке, по старинке. А мы говорим, что это государственное преступление».

Ленин. Речь на I совещании по партийной работе в деревне. 19.11.19. Сочинения, т. 30, с. 128.

«Не спит ли наш НКюст? Тут нужен ряд образцовых процессов с применением жесточайших кар. НКюст, кажись, не понимает, что новая экономическая политика требует способов новой жестокости кар».

Ленин. 11.02.22. ПСС, т. 54, с. 160.

Самое дорогое—детям?

ФИРМА SAFID САФИД

ГАРАНТИРУЕТ: ВАШИ ДЕНЬГИ БУДУТ ОБЕСПЕЧЕНЫ ЗОЛОТОМ

Вы, конечно, боитесь инфляции, Вы,конечно, боитесь грядущих правительственных перемен,Вы,конечно,хотите спасти свои сбережения - давайте попробуем сделать это вместе!

Фондовый отдел фирмы "Сафид" предлагает всем гражданам неизвестный пока в нашем государстве вид услуг.

Как известно, только лишь вложенные в дело деньги приносят прибыль и сохраняются. Мы предлагаем Вам вложить деньги в ценные бумаги. Мы сделаем это за Вас. Мы обеспечим Вам 18% дохода в год от вложенных сумм. Сберегательный банк, кстати, выплачивает до 7%. Предлагаем Вам две схемы обслуживания - выбирайте:

Схема А: за небольшую плату Вы можете проконсультироваться с нашими специалистами, которые предложат Вам и помогут приобрести во владение наиболее твердые и наименее рискованные акции на рынке ценных бумаг. После приобретения Вы сможете распоряжаться ценными бумагами по собственному усмотрению.

Схема Б: Вы подписываете с нами договор поручения, вносите любую кратную 100 сумму (1000, 1500, 2000 и т.д.), и дальше мы сами решим, какими акциями лучше всего обеспечить Ваши средства, более того , мы будем содержать Ваши ценные бумаги с особой тщательностью, ежедневно проверяя котировки, продавая акции в том случае, если их стоимость падает, и приобретая взамен те, чья стоимость растет . В этой схеме мы не возьмем с Вас плату. Более того, мы обязуемся выплатить Вам доход не менее 18 % годовых. В любое время Вы сможете получить на руки либо средства с начисленными на них процентами, либо ценные бумаги, которыми на момент появления у Вас желания изъять финансы, будут обеспечены Ваши средства.

Представим работу фондового отдела фирмы.

Ежедневные котировки ценных бумаг, владение специфической информацией о степени ликвидности средств компаний, существующих на нашем фондовом рынке, мгновенная реакция на изменение рынка, владение полной конфиденциальной информацией об организациях - эмитентах.

А ТЕПЕРЬ ВНИМАНИЕ!

Заключив договор с фирмой "САФИД", Вы избавитесь от проблемы, как спасти свои деньги в любых условиях. Помните, что имея ценные бумаги предприятий, Вы являетесь совладельцем основных фондов этих предприятий. У нас интереснее хранить деньги. У нас и надежнее. Уже на сегодняшний день вложенные Вами средства будут обеспечены акциями акционерного общества "РОССИЙСКОЕ ЗОЛОТО" - генерального подрядчика правительства России на добычу золотого запаса для Российской Федерации. Мы с гордостью сообщаем, что являемся совладельцами этого акционерного общества.

Итак, для тех, кого не убедила наша реклама, впрочем, и для тех, кого она убедила, публикуем котировки рынка ценных бумаг по состоянию на 28 февраля 1992 года. А Вы решайте, либо самим плавать в этом море, либо поручить это нашим специалистам.

АКЦИОНЕРНЫЕ ОБЩЕСТВА	НОМИНАЛ	КУРС ПРИОБРЕТЕНИЯ	ГОДОВОЙ %
А/О "АВТОВАЗБАНК"	1000	1620	15
А/О "ДЕЛОВАЯ РОССИЯ"	1000	2100	11
А/О "ИНКОМБАНК"	10000	19200	14
А/О "ПЕРМАВИА"	250	1570	12
А/О "СОЮЗ-САТУРН"	1000	1710	20

Сообщаем наш прогноз на самые твердые акции в ближайшее время. Кстати, их мы тоже собираемся приобретать для Вас.

БЕЛОРУССКИЙ БИРЖЕВОЙ БАНК — Планируемый дивиденд 15%; Уставной фонд 100 млн. рублей

"ЭКМАШТРАНС" инвестиционный акционерный торгово-внедренческий дом — Планируемый дивиденд 16 %; Уставной фонд 200 млн.рублей

"АЛЬЯНС" Калининградская региональная инвестиционно-финансовая компания — Планируемый дивиденд 18-20 %; Уставной фонд 100 млн.рублей

"ФИНИНВЕСТ" — Планируемый дивиденд не менее 18 %; Уставной фонд 1,2 млрд.рублей

"ИСТКОРП" — Планируемый дивиденд до 30%; Уставной фонд 60 млн.рублей

"ИНКОРОС" — Планируемый дивиденд 14 %; Уставной фонд 600 млн.рублей

"НИПЕК" — Планируемый дивиденд 14 %; Уставной фонд 4,2 млрд.рублей

ВНИМАНИЕ!

Данные рекомендации не обязательно принесут Вам дивиденды, ведь с акциями необходимо работать ежедневно, чтобы получить гарантированный доход!

Для удобства наших потенциальных клиентов публикуем запрос для фирмы "САФИД" на заключение договоров. По получении запроса наши коммерческие представители свяжутся с Вами незамедлительно.

Ф.И.О._____

Подробный почтовый адрес: _____

Телефон: _____ **домашний** _____ **рабочий**

Прошу выслать в мой адрес подробные инструкции по схеме А;

схеме Б (нужное подчеркнуть, ненужное вычеркнуть)

Сумма предполагаемой покупки: _____

Справки можно также получить по телефонам:

8-0212-377356

телефон, он же факс: 8-0212-372629

и лично по адресу: 210724, г.Витебск, ул.Замковая, дом 4, 423

Фирма "САФИД"

Зачем Вам ломать голову на рынке ценных бумаг, доверьте это нашим специалистам, и Ваши средства будут защищены от реформ, введения национальной валюты, инфляции.

Конфиденциальность мы гарантируем!

ДЛЯ ОРГАНИЗАЦИЙ, ИМЕЮЩИХ СВОБОДНЫЕ СРЕДСТВА, ФИРМА "САФИД" ПРЕДЛАГАЕТ ОПЦИОНЫ НА ПРИОБРЕТЕНИЕ ПАКЕТОВ ИЗ ЧЕТЫРЕХ АКЦИЙ АКЦИОНЕРНОГО ОБЩЕСТВА "РОССИЙСКОЕ ЗОЛОТО" НОМИНАЛЬНОЙ СТОИМОСТЬЮ 100 ТЫСЯЧ РУБЛЕЙ, ПРОДАЖНОЙ — 500 ТЫСЯЧ РУБЛЕЙ КАЖДАЯ.

Десять дней назад они продавались по 250 тысяч, а если взглянуть на десять дней вперед . . .

?

Наш адрес: 210724, г.Витебск, ул.Замковая, дом 4, 423

Фирма "САФИД"

Наши телефоны: 8-0212-377356

телефон, он же факс: 8-0212-372629

Для справки: А/О "Российское золото" - самое стабильное, на наш взгляд, акционерное общество на сегодня. "Российское золото" возглавляет известный всей стране бывший руководитель старательной артели "ПЕЧОРА" Владимир Туманов. Акционерным обществом получен 100-процентный заказ правительства России на добычу золотого запаса Российской Федерации. Ваши деньги будут обеспечены не банковскими документами, а **золотом России!**

Мечеть в Беларуси

Эта фотография нашим фотокорреспондентом сделана в райцентре Ивье Гродненской области в единственной в нашей республике действующей мечети. Ее посещают верующие татары.

А история появления этих жителей нашего края восходит еще ко временам Грюнвальдской битвы.

Когда-то предки татар пришли сюда из Крыма и породнились со славянской землей. Они сохранили свои обычаи. Сама многовековая жизнь татар на территории Беларуси—пример ее уникальной истории.

Фото Ю. РЕБРОВА.

Возвращаясь к напечатанному

ВСПЯТЬ РЕКУ НЕ ПОВЕРНУТЬ!

Читатели помнят февральскую публикацию «Директора опровергают ученики» (№ 4 от 19.02.1992 г.). Раздаются телефонные звонки из городов и районов области. Люди задают вопрос: извинилась ли директор СШ № 9 гор. Витебска Т. Дулина (как этого и потребовал народный суд) перед учительницей белорусского языка и литературы Т. Ламчановской?

Я тоже ненароком думал, что Татьяна Николаевна как это сделать было бы ей ни прискорбно, наберется мужества и выполнит решение суда. Чего проще, поступать согласно норм общечеловеческой морали? Касается это любого человека. А директору школы, за спиной которого огромный коллектив из педагогов и учащихся, еще надо беспокоиться и о личном примере.

Парадокс в том, что характер директора школы годами «закалялся» на огне административно-командной горелки.

Думала бы Т. Дулина о состоянии педагогического процесса, о ребятах, об их наставниках, не допустила и близко бы этих судебных заседаний, на которые вызывались бывшие выпускники, учителя, родители. Истинный педагог, тем более директор, знал бы, как поступить, чтобы остаться справедливым и тактичным, постарался во что бы то ни стало уберечь школу от потрясения. А оно—это потрясение, к сожалению, состоялось и по милости ее руководителя.

Лично для меня, уважаемый читатель, продолжение этой драмы в школе не стало неожиданным. Накануне публикации материала «Директора опровергают ученики» Т. Дулина посетила редакцию. Мы беседовали вдвоем. Она пыталась убедить корреспондента в правоте своего «дела», продолжала атаковать как и на заседаниях народного суда. Если директор, несмотря ни на какие доводы и, прежде всего, на решение суда, идет напролом, и притом в редакционном кабинете, то интересно, как он разговаривает в школе, с подчиненными? Как тут не забеспокоиться, не воскликнуть, что школа не место для сведения счетов и если уже ты, руководитель, проиграл в судебном разбирательстве, остановись хотя бы после этого во имя сохранения мира во вверенном тебе коллективе?

Т. Дулина не остановилась, подала кассационную жалобу на решение народного суда. На что надеялась Татьяна Николаевна? Предположим, выиграла бы в итоге столь затянувшийся процесс (в случае, если бы областной суд удовлетворил ее жалобу). Что бы это дало? Еще больше бы выбило школу из колеи. Впрочем, а была ли эта школа в нужной колее? Если только в той, в которой ей позволяла быть административно-командная система!

Надежда директора повернуть вспять реку справедливости исчезла, как мираж. Областной суд решение народного суда Железнодорожного района г. Витебска оставил без изменений, а кассационную жалобу Т. Дулиной—без удовлетворения.

В период безраздельного телефонного права, при господстве КПБ—КПСС можно было надеяться, что черное назовут белым, можно было жить по принципу: я—начальник, ты—дурак! Это время, к счастью, прошло, а кое-кто не хочет в это поверить, на что-то надеется, пытается его вернуть, устраивает худосочные митинги на стадионе «в защиту прав трудящихся», за возвращение СССР. Не положение народа волнует бывших номенклатурщиков, а их, собственное! Отняло время у них возможность властвовать, слушать вопросы на заседаниях всяких партийных бюро, а точнее—толочь воду в ступе и низачто получать деньги, пользоваться благами. Вот и вроде бы бунтуют, хоть и жалко на них глядеть—не понимают, что колесо истории назад не покрутится. Так, кажется, утверждает и марксизм-ленинизм.

Зайдем в любую школу. Почти каждая из них перекособочена в сторону выпячивания военно-патриотического воспитания. Как будто это основная норма нравственности. Вся атрибутика эпохи социализма в школе налицо. Как будто бы в общественно-политической жизни не произошло никаких изменений. Уже и областной Дворец пионеров изменил свое название. А в школах все еще чтут задубевшие пионерско-комсомольские традиции. В большинстве своем-то директора школ—бывшие номенклатурщики, как и руководители народного образования вышестоящих рангов. Каждого из них скрупулезно просвечивали под партийным рентгеном, смотрели в основном анкету, проверяли на предмет лояльности режиму.

Не только звонят в редакцию после опубликования материала «Директора опровергают ученики». Приходят делегациями и в одиночку. Просят вмешаться, избавить коллектив от перекосов в руководстве школ. Когда же дело доходит о необходимости огласки тех, кто обращается к журналистам, срабатывает тормоз. Люди просят не называть их фамилий, боятся преследований. И это в нашей советской школе, в которой согласно указания великого кормчего народов пытались поставить учителя на самую небывалую высоту.

Страх еще мертвой хваткой держит наших учителей, страх перед директором, перед проверяющими и прочими вышестоящими. Какими же вырастут ученики тех наставников, которые из-за этого вечного страха так и не смогли состояться как личности? Понимает ли нынешнее учительство, что только правовая защита педагога (которой нет), только истинная демократизация народного образования (которой не существует тоже) смогут сделать наставника полноценным профессионалом, настоящим другом детворы?

После решения областного суда не в пользу директора школы, я встретился с заведующим гороно В. Пресняковым.

Виктор Александрович в беседе мне сообщил, что к началу нового учебного года будут решены кадровые вопросы по укреплению руководства школы № 9.

А нравственные потери? Кто за них ответит? И состоится ли еще один суд—суд совести?

Б. ХАМАЙДА.

P. S. Публикуем заявление, которое не нашло подтверждения в народном суде:—Мы, нижеподписавшиеся учителя средней школы № 9 города Витебска, считаем необходимым заявить о том, что Ламчановская Т. А. обещала учащимся выставить хорошие оценки, если они поддержат ее и она останется работать в школе.

Такой поступок учителя в отношении учащихся и своего коллеги Ситовой Л. И., на наш взгляд, противоречит нормам педагогической этики.

Просим приобщить наше заявление в качестве свидетельских показаний. В связи с тем, что 21 января учебный день, явиться в суд мы не можем.

А. Поливкин, Л. Церковская, Т. Плавинская, Р. Булычева, С. Мищенко, Л. Ситова, М. Аралина, Г. Ломинцева, Н. Шевелева, Е. Давыдовская, Р. Петрилина, Т. Калиновская.

Што б гэта значыла?

(з аб'явы)

16 сакавіка ў канферэнц – зале рэдакцыі для супрацоўнікаў «Віцебскага рабочага» адбудзецца сеанс лячэння, які праводзіць Вярхоўны жрэц Храма бессмяротнасці «Чорны лотас» БОНПО Лан.

пачатак у 14.00

Цікава, які пастаўлены дыягназ?

СОБОЛЕЗНОВАНИЕ

Хотим выразить соболезнование всем членам партии коммунистов Беларуси (ПКБ). Как сообщил 17 марта утром «Радиофакт», Министерство юстиции Республики Беларусь отказало ПКБ в регистрации Устава. Это правильно. Ведь ПКБ руководствуется теми же принципами, что и бесславно почившая КП Белоруссии.

Как бы ни хотелось, но многим товарищам придется отказываться от великого ленинского учения. Есть перспектива в бизнес (если возьмут).

Группа бывших товарищей.

БЕССАРДЭЧНАСЦЬ

мясцовых улад да асірацелай сям'і чарнобыльскага ліквідатара

(Заканчэнне. Пачатак на 6-й стар.).

тым, што пацярпеўшыя, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жылой плошчы, забяспечваюцца ёй без чаргі на працягу года, ды яшчэ ў дадатак атрымліваюць дадатковую жылую плошчу ў выглядзе асобнага пакоя. Апрача таго, ім прадастаўляецца скідка ў памеры 50 працэнтаў з устаноўленай платы за карыстанне ацяпленнем, водаправодам, газам і электраэнергіяй, а пражываючым у дамах, якія не маюць цэнтральнага ацяплення, прадастаўляецца 50-працэнтная скідка з кошту паліва, набываемага ў межах норм, устаноўленых для продажу насельніцтву.

Нічым гэтым асірацелая сям'я Скрыпутаў не карыстаецца. Больш таго, Людміла Вячаславаўна пражывае разам з двума сынамі ў дашчэнту струхлелай драўлянай будыніне, якую і домам назваць цяжка.

—Жывем мы ў гэтай хібары амаль чатырнаццаць гадоў,—расказвае Людміла Вячаславаўна.—і ні разу ніхто яе за гэты час не рамантаваў. Ды і да нашага засялення рамонту ніхто не праводзіў...

Сумна выглядае гэтая будыніна як з вуліцы, так і знутры. Сцены яе паміж вокнаў выпнуліся на вуліцу, таго і чакай, вываляцца, уваходныя дзверы ўсе ў дзірках.

—Прыходзілі з камунгаса, якому належыць дом, некалькі гадоў назад,—працягвала Людміла Вячаславаўна.—Паглядзелі, і больш мы нікога не бачылі. Праўда, у канцы мінулага лета пачалі ўстанаўліваць у доме трубы вадзянога ацяплення, але, не закончыўшы гэтую работу, зніклі...

—Тут і жыць небяспечна,—памаўчаўшы, працягвала гаспадыня.—Печы растрэскаліся, дымяць, у любы момант можна чакаць бяды. А сцены якія...—Яна кранула рукой абвіслыя пажоўклыя шпалеры, і з-пад іх пасыпаліся дробныя кавалачкі тынкоўкі. І столь гэтакая ж, як і сцены, ненадзейная, таму цёпла ў нашым доме бывае толькі тады, калі палім у печах.

Людміла Вячаславаўна не чакае цярпліва, пакуль ёй прынясуць усё гатовае на сподачку. Яна ўпарта «штурмуе» розныя ўстановы раёна, аднак нічога пакуль дабіцца не змагла. «Няма магчымасці забяспечыць вас добраўпарадкаванай кватэрай»,—адказвалі ёй і былая сакратар былога райкома КПБ М. Савельева, і былы старшыня райвыканкома П. Новік, і цяперашні намеснік старшыні раённага Савета народных дэпутатаў М. Завадскі.

—У Міхаіла Фёдаравіча я нават тройчы пабывала,—расказвала Людміла Вячаславаўна.—У апошні раз ён прыняў мяне холадна, нават сесці не запрасіў, буркнуў нешта, не ўзнімаючы галавы...

Балюча дзейнічае на ўдаву чарнобыльца такая няўвага раённых кіраўнікоў на яе бяду, нічым не хочуць дапамагчы яны гаротнай жанчыне.

—Наплачуся і нервы папсую—вось і ўвесь вынік маіх хаджэнняў па розных арганізацыях,—цяжка ўздыхнула Людміла Вячаславаўна.—Ці ж думала я, што такія бессардэчныя нашы кіраўнікі, кожны з якіх засяліў дабротны асабняк і, груба кажучы, чхае на тых, хто трапіў у бяду не па сваёй ахвоце.

Цяжка да гэтага дадаць што-небудзь.

М. БАШАРЫМАЎ.

Следующий номер газеты выйдет 1 апреля 1992 года

Выбар

УЧРЕДИТЕЛЬ:
Витебский городской клуб избирателей «За демократические выборы».

Главный редактор
Леонид ЦВИКА

Художник Г. Кликушин.
Фотографии А. Гапонова.
Адрес редакции: 210601, г. Витебск, ул. Гоголя, 17, тел. 37-35-06, 37-28-44.

Авторы опубликованных материалов несут ответственность за подбор и точность приведенных фактов, цитат, экономико-статистических данных, имен собственных, географических названий и прочих сведений, а также за то, что в материалах не содержится данных, не подлежащих открытой публикации.

Редакция может опубликовать статьи в порядке обсуждения, не разделяя точку зрения автора.

Рукописи не возвращаются и не рецензируются.

Текущий счет редакции № 200700962 в Витебском коммерческом банке («Виткомбанк»). Код (МФО) банка 150801701.

Газета набрана и отпечатана офсетным способом в Витебской укрупненной типографии им. Коминтерна: гор. Витебск, ул. Щербакова-Набережная, 6.

Полиграфисты: **В. Корунас, Т. Халеева, Л. Дроздова, А. Каспорович, Д. Малышев, Б. Платовский.**

Номер подписан к печати 18.02.92 г. в 17.15.

Зак. 1588 Тираж 2500.

Цена 40 коп.